# СТАНКЕВІЧ КАНСТАНЦІН КАНСТАНЦІНАВІЧ (КАСТУСЬ СТАНКЕВІЧ)

Паэт. Журналіст. Член Беларускага саюза журналістаў. Нарадзіўся ў 1944 годзе на Бераставічынне. Скончыў фізіка-матэматычны факультэт Гродзенскага педінстытута. Выкладаў у школах Бераставіцкага і Лідскага раёнаў. У прафесійнай журналістыцы працуе з 1984 года, працаваў загадчыкам аддзела сельскай гаспадаркі і сацыяльных праблем “Воранаўскай газеты”, а таксама ўласным карэспандэнтам рэспубліканскай газеты “Транспортный вестник” па Гродзенскай вобласці. Яго вершы друкаваліся ў “Гродзенскай праўдзе”, “Настаўніцкай газеце”, “Белорусской ниве”, у калектыўных зборніках і г.д. Аўтар песен, музыку да якіх напісаў самадзейны кампазітар, выкладчык Воранаўскай дзіцячай школы мастацтваў А.А.Мацюк. Адна з найбольш папулярных – песня “Адам і Марыля” – увайшла ў рэпертуар многіх калектываў мастацкай самадзейнасці і прафесійных выканаўцаў.

**Бібліяграфія:**

Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў (гал.рэд.) і інш.; мастак Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн., 2004. – С. 437.